ISSN 3072-3140, eISSN 3072-4376
Copyright © by Palina Masliankova, 2025
Creative Commons Attribution-NonComercial 4.0
(CC BY-NC 4.0)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc/4.0/
DOI: https://doi.org/10.31338/uw.ijbg.2025.5

Паліна Маслянкова ♦ Palina Masliankova

Адукацыйны праект *Беларуская мова пакрысе*
Educational Project "Belarusian Language Step by Step"
ORCID: https://orcid.org/0009-0006-2346-554X
e-mail: palina.masliankova@gmail.com

Досвед ужывання методыкі выкладання мовы як замежнай на занятках па беларускай мове для дарослых беларусаў

Applying Foreign Language Teaching Methods in Teaching Belarusian to Adult Belarusians

Abstract: The article describes practical experience in applying foreign language teaching methods to the teaching of Belarusian to adult Belarusians who wish to use the language for everyday communication. The issue is particularly relevant because, despite Belarusian's formal status as a state language, a significant proportion of the population of Belarus cannot use it for everyday communication. The mismatch between existing teaching methods and learners' needs has repeatedly been raised within the educational community, but a systematic solution has yet to be developed. The article examines teaching experience in the non-formal education course "Belarusian Language Step by Step". It emphasises that methods commonly used in foreign language teaching—such as listening comprehension followed by discussion, role-playing, communicative exercises, and work with visual materials—help develop speaking skills and confidence in communicating in Belarusian. The paper discusses how exercises commonly used in foreign language teaching can be adapted to the Belarusian context: selecting an appropriate level of difficulty for learners with partial knowledge of the language, choosing topics relevant to adult life, and developing critical and associative thinking. Attention is also paid to the shortage of appropriate teaching materials and the need to systematize pedagogical experience to develop a comprehensive methodology for teaching Belarusian as a second native language. The findings may be useful both for teachers working with adult learners and for developers of educational programs, textbooks, and initiatives aimed at expanding the use of Belarusian in contemporary society.

Keywords: Belarusian language, glottodidactics, teaching methodology, communicative approach, methodological terminology.

Рэзюмэ: У артыкуле апісваецца практычны досвед выкарыстання методык навучання мове як замежнай пры выкладанні беларускай мовы дарослым беларусам, якія імкнуцца авалодаць ёю на камунікатыўным узроўні. Актуальнасць праблемы абумоўлена тым, што, нягледзячы на фармальны статус беларускай мовы як дзяржаўнай, значная частка насельніцтва Беларусі не валодае ёю як жывой камунікатыўнай

сістэмай. Праблема метадычнай неадпаведнасці ўжо неаднаразова агучвалася ў адукацыйным асяроддзі, аднак дагэтуль не знайшла сістэматызаванага вырашэння. У артыкуле разглядаецца досвед выкладання ў межах нефармальнай адукацыйнай праграмы *Беларуская мова пакрысе*. Падкрэсліваецца, што выкарыстанне метадаў, характэрных для навучання замежным мовам, – напрыклад, аўдыяванне з наступным абмеркаваннем, ролевыя гульні, практыкаванні на камунікацыю і праца з візуальнымі матэрыяламі – спрыяе развіццю маўлення і ўпэўненасці ў зносінах па-беларуску. Разглядаюцца асаблівасці адаптацыі практыкаванняў, якія ўжываюцца ў выкладанні моваў як замежных, пад беларускі кантэкст: вызначэнне аптымальнага ўзроўню складанасці для людзей, якія часткова валодаюць мовай; выкарыстанне тэм, актуальных для дарослага жыцця; развіццё крытычнага і асацыятыўнага мыслення. Увага надаецца таксама праблемам недахопу адпаведных навучальных матэрыялаў і патрэбе ў сістэматызацыі педагагічнага досведу для далейшай распрацоўкі паўнавартаснай методыкі навучання беларускай мове як другой роднай. Матэрыял артыкула можа быць карысным як для настаўнікаў, якія працуюць з дарослай аўдыторыяй, так і для стваральнікаў навучальных праграм, падручнікаў і адукацыйных ініцыятыў, арыентаваных на пашырэнне сферы выкарыстання беларускай мовы ў сучасным грамадстве.

Ключавыя словы: беларуская мова, глотадыдактыка, методыка выкладання, камунікатыўны падыход, метадычная тэрміналогія.

Уводзіны ў праблему. У сучасным беларускамоўным адукацыйным дыскурсе выразна праяўляецца дысананс паміж афіцыйным статусам беларускай мовы і фактычнай моўнай сітуацыяй у Рэспубліцы Беларусь. Беларуская мова ў агульнаадукацыйных установах краіны выкладаецца як родная, аналагічна з расійскай мовай. Аднак у рэчаіснасці пераважная большасць дзяцей, што прыходзяць у першы клас, размаўляюць па-расійску і не валодаюць беларускай мовай на базавым камунікатыўным узроўні. Для іх беларуская мова – гэта не сродак зносін з ранняга дзяцінства, а яшчэ адзін прадмет, які ўпершыню ўваходзіць у жыццё праз падручнік і настаўніцкае слова.

Такое становішча стварае шэраг метадычных выклікаў. Настаўнік праз усе школьныя гады вымушаны ўдаваць, што дзеці добра валодаюць беларускай мовай, і выкладаць яе як родную – з адпаведным аб'ёмам лексіка-граматычнага матэрыялу і тыпам заданняў, – але пры гэтым працаваць з навучэнцамі, якія на ёй не размаўляюць у жыцці. Такім чынам, дзеці сталеюць і ператвараюцца ў дарослых, якія вучылі беларускую мову ў школе, але так і не навучыліся размаўляць па-беларуску.

Кандыдат філалагічных навук Лявон Баршчэўскі, колішні завуч Беларускага гуманітарнага ліцэя, у 2020 годзе выказваў думку, што ў выкладанне беларускай мовы беларусам важна інтэграваць метады выкладання мовы як замежнай: "У сутнасці, трэба браць тыя методыкі, па якіх вывучаюцца замежныя мовы, гаварэнне, і толькі тады мы атрымаем на выхадзе дзяцей, якія будуць гаварыць па-беларуску" [Баршчэўскі 2020].

Аднак у межах круглага стала *Як захаваць адзін з самых важных складнікаў культурнага кода нацыі?* [Ляўковіч 2025], праведзенага і апублікаванага газетай "Звязда" да Дня роднай мовы ў 2025 годзе, гучалі іншыя меркаванні. Праблема была агучаная вядоўцай дыскусіі Аленай Ляўковіч:

> **"Звязда":** Давялося чуць, і неаднойчы, рэпліку ад тых жа бацькоў: беларускую мову вывучаць складана, бо дзеці не валодаюць лексікай, слоўнікавым запасам, а праграма школьная, граматыка, якая вывучаецца, разлічана менавіта на носьбітаў мовы. А якія спражэнні і скланенні, калі дзіця не ведае значэння слоў? **Можа, варта пераглядаць методыкі выкладання, пачынаць вывучаць беларускую мову як замежную?**

На што ўдзельнікі дыскусіі з галіны беларускай адукацыі адказалі рэзкімі пярэчаннямі:

> **Вольга Зелянко**, прарэктарка па навуковай рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі (ДУА) *Акадэмія адукацыі*: **Ні ў якім разе гэтага нельга рабіць!** Методыка навучання беларускай мове – вельмі сур'ёзная навука, якая даследуе ў тым ліку заканамернасці маўленчага развіцця дзіцяці, засваення мовы. Як толькі мы станем у Беларусі вывучаць беларускую мову як замежную, мы дапусцім вялізную педагагічную і метадычную памылку.
>
> **Георгій Чахоўскі**, загадчык кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта БДУ: **Вывучаць беларускую мову як замежную – гэта не тое што непажадана, гэта бессэнсоўна і дэструктыўна.** Розныя алгарытмы засваення роднай мовы і замежнай. А беларуская мова – родная на генетычным узроўні. Родную мову мы вывучаем неўсвядомлена – шляхам пераймання, асабістай зацікаўленасці, праз добры прыклад.

Сапраўды, калі дзіця гадуецца ў беларускамоўным асяроддзі, то яму ёсць што пераймаць і дзе пачуць добры прыклад. Але беларускія метадысты ігнаруюць той факт, што сучасныя беларускія дзеці практычна нідзе не чуюць беларускай мовы, калі іх бацькі адмыслова не вышукваюць для іх беларускамоўны кантэнт, не набываюць беларускіх кніжак, не ўключаюць мульцікаў па-беларуску і не размаўляюць з імі на беларускай мове.

Як праблема методыкі выкладання беларускай мовы разглядаецца ў метадычнай літаратуры?

> Тэрмін **методыка выкладання беларускай мовы як замежнай** у дачыненні да беларусаў выклікае ў акадэмічных колах рэзкую негатыўную рэакцыю, таму рэкамендуецца ў прасоўванні гэтай методыкі карыстацца іншымі тэрмінамі, адным з якіх можа быць **дзейнасны падыход**, які атрымаў сваю інтэрпрэтацыю ў межах розных падыходаў: **асобасна-дзейнаснага**, які ўлічвае, што ў цэнтры навучання знаходзіцца сам навучэнец – яго матывы, мэты, індывідуальныя асаблівасці, непаўторны псіхалагічны склад; **камунікатыўна-дзейнаснага**, які арыентуе на навучанне маўленчым зносінам, выкарыстанне мовы з мэтай абмену думкамі. Яго мэта – фарміраванне і развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі (здольнасці і гатоўнасці навучэнцаў да маўленчых зносін); **кампетэнтнасны падыход**, які патрабуе пераарыентавацца з пазіцыі "ведаць, каб памятаць" на пазіцыю "ведаць, каб умець і дзейнічаць", калі мае значэнне не сума засвоеных ведаў, а здольнасць чалавека дзейнічаць у разнастайных сітуацыях [Валочка 2020: 6].

У метадычнай літаратуры можна сустрэць крытычныя заўвагі да існай праграмы, рэалізаванай у падручніках:

> **Камунікатыўна-маўленчы аспект** выкладання беларускай мовы, вызначаны ў нарматыўных дакументах і праграме па беларускай мове для агульнаадукацыйнай школы, павінен рэалізавацца ў школьных падручніках, дзе практычны матэрыял пададзены па раздзелах і тэмах школьнага курса. Як сведчыць лінгвадыдактычны экспрэс-аналіз абранага падручніка па беларускай мове для 5-га класа школ з беларускай і рускай мовамі навучання, **прынцып актыўнай камунікацыі рэалізуецца не заўсёды паслядоўна**. Вядома, што названы прынцып звязаны з прызначэннем мовы быць сродкам зносін. З паваротам методыкі да асобы вучня, да асобы, якая гаворыць, чытае, успрымае, слухае і піша, асноўнай мэтай навучання становіцца навучанне маўленчай дзейнасці сродкамі мовы, што немагчыма без уключэння самой асобы ў гэты працэс. У школьным падручніку ўсё ж **недастаткова маўленча-арыентаваных практыкаванняў і заданняў**, набліжаных да рэальнага працэсу зносін, практыкаванняў праблемнага і творчага характару. Так, у заданнях пераважаюць фармулёўкі *спішыце…*; *запішыце…*; *выпішыце…*; *устаўце…*; *падкрэсліце…* і інш., якія, вядома, **недастаткова накіроўваюць на суразмоўніцтва** і **не зусім актыўна арыентуюць школьнікаў на камунікатыўна-маўленчую дзейнасць** [Шандроха 2010: 299].

Гучаць таксама рэкамендацыі "ўключыць у падручнік больш практыкаванняў з тэкстамі,

якія выхоўвалі б культуру ўзаемаадносін, развівалі б эмацыйную сферу пяцікласнікаў, дэманстравалі б ужыванне нацыянальна маркіраваных канструкцый у маўленні, безэквівалентных выразаў, прэцэдэнтных тэкстаў, што адлюстроўваюць жыццёвую мудрасць беларусаў" [Шандроха 2010: 300].

І некаторыя настаўнікі сапраўды рэалізуюць гэта на занятках:

> На сваіх уроках беларускай мовы праводжу лексічныя і фразеалагічныя хвілінкі, якія займаюць мала часу, могуць выкарыстоўвацца на розных этапах, не супярэчаць асноўнай адукацыйнай тэме і ў той жа час узбагачаюць слоўнікавы запас вучняў нацыянальна-маркіраванымі моўнымі адзінкамі. У якасці лексічных хвілінак прапаную вучням заданні на знаходжанне *чацвёртага лішняга*, падбор аднаслоўных адпаведнікаў, суаднясенне слова з яго лексічным значэннем, размеркаванне слоў у тэматычныя групы [Кайданава 2024: 126].

Такім чынам, у метадычнай літаратуры часам гучыць думка пра тое, што варта шырэй ужываць тэматычна-сітуацыйны прынцып, выкарыстоўваць камунікатыўна-маўленчы падыход, рабіць акцэнт на лексіку і граматыку, але робіцца гэта нясмела, без канкрэтных захадаў ці заклікаў адаптаваць школьную праграму і падручнікі пад рэальную сітуацыю.

З кароткага агляду тэндэнцый у методыцы выкладання вынікае, што ў афіцыйным дыскурсе назіраецца адмаўленне відавочнай праблемы неадпаведнасці методыкі выкладання беларускай мовы ў школе рэальным патрэбам навучэнцаў, іх сапраўднаму ўзроўню валодання беларускай мовай. У выніку чаго выпускнікі школ ведаюць беларускую мову *на паперцы* і могуць часам слушна расставіць знакі прыпынку ў сказе ці нават здаць тэст на выдатна, але так і не ўмеюць вольна размаўляць па-беларуску.

Інтэграцыя і адаптацыя метадаў выкладання беларускай мовы як замежнай. У апошнія 3–5 гадоў назіраецца рост цікаўнасці да беларускай мовы сярод дарослых беларусаў [Бандаровіч 2024; Гіліца 2024; Маслянкова 2025], якія не здолелі добра вывучыць беларускую мову ў школе, што спарадзіла попыт на падручнікі і заняткі па беларускай мове ўжо ў сталым веку. Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца аналіз і апісанне метадаў лінгвадыдактычнай працы з дарослай аўдыторыяй беларусаў у межах нефармальнай адукацыі. Падыход базуецца на спалучэнні традыцыйных методык навучання роднай мове і прынцыпаў выкладання мовы як другой або замежнай. Пры гэтым улічваецца, што

> выкладанне беларускай мовы беларусам адрозніваецца ад выкладання беларускай мовы замежнікам, хаця некаторыя методыкі і матэрыялы на першы погляд падобныя. Напрыклад, паралелі з расійскай мовай, якія часта выкарыстоўваюцца на занятках з беларусамі, не рэкамендуецца выкарыстоўваць у выкладанні беларускай мовы замежнікам [Калета 2015: 145].

Апісаны ў дадзеным артыкуле падыход рэалізоўваўся аўтаркай на працягу 3 гадоў у межах 37 груп дарослых беларусаў, а гэта больш за 400 выпускнікоў аднаго або некалькіх з чатырох распрацаваных аўтарскіх курсаў *Мова штодзённасці*, *Мова супольнасці*, *Мова стасункаў* і *Мова культуры*. Кожны двухмесячны анлайн-курс складаецца з 9 тэматычных заняткаў, разлічаных на 2 астранамічныя гадзіны. У групе ў сярэднім займаецца 12–15 чалавек, а на заданні і абмеркаванні група дзеліцца на падгрупы па 2–3 чалавекі. Праграма кожнага курса ўключае дамашнія заданні і штодзённыя заданні ў чаце групы для практыкі і актуалізацыі ведаў. Варта адзначыць, што назіранне за тым, як арганізуюцца заняткі па замежных мовах, дало штуршок для фармавання ўласнага падыходу аўтаркі да выкладання беларускай мовы як другой роднай. У гэтым артыкуле прапануецца аналіз відаў адукацыйнай дзейнасці, тыпаў заданняў і практыкаванняў, якія былі перанесеныя і ўжытыя ў практыцы амаль без зменаў, а пэўныя давялося адаптаваць, ускладніць або цалкам ад іх адмовіцца. У артыкуле

паказана, як можна адаптаваць розныя заданні для развіцця гаварэння і пісьма, успрымання тэксту на зрок і на слых, узбагачэння лексічнага запасу і засваення граматыкі.

У дадзеным кантэксце варта ўсведамляць істотную розніцу ў матэрыяльным і метадычным забеспячэнні выкладання беларускай і замежных моваў. Так, для ангельскай ці польскай мовы існуе шырокі спектр навучальных платформаў, метадычных комплексаў і аўдыявізуальных матэрыялаў, якія дазваляюць будаваць навучанне на высокім камунікатыўным і тэхналагічным узроўні. Для беларускай мовы, наадварот, колькасць адпаведных рэсурсаў застаецца мізэрнай. Сярод нешматлікіх выключэнняў можна назваць падручнік для замежнікаў *Беларуская мова? З задавальненнем!* Таццяны Рамзы [2010], што ўключае аўдыядыск, а таксама падручнік для саманавучання беларускай мове Антона Соміна [2017], арыентаваны на рускамоўную аўдыторыю, але без аўдыявізуальнага суправаджэння.

У выніку для адмысловай групы навучэнцаў-беларусаў, якія вывучалі беларускую мову ў школе, але хацелі б не проста здаць тэст, а сапраўды вольна размаўляць па-беларуску, – падручнікаў ці дапаможнікаў катастрафічна бракуе. Для гэтай мэтавай аўдыторыі за апошнія гады выйшлі, у прыватнасці, кнігі *20 крокаў да беларускай мовы* (2 часткі) Алесі Літвіноўскай і Глеба Лабадзенкі [2016, 2017]. Плюсы і мінусы існых дапаможнікаў для самастойнага вывучэння беларускай мовы разглядала ў сваім артыкуле Таццяна Рамза [2017]. Недахоп метадычнай базы вымушае настаўнікаў самастойна распрацоўваць матэрыялы перад кожнымі заняткамі і вышукваць уласны падыход замест таго, каб абапірацца на гатовыя, сістэматызаваныя адукацыйныя рэсурсы.

Разуменне маўлення на слых. Практыкаванні, арыентаваныя на разуменне маўлення на слых, для расійскамоўных беларусаў, якія вучылі беларускую мову ў школе, падаюцца залёгкімі і хутка страчваюць сэнс у тым выглядзе, у якім мы прызвычаіліся іх выкарыстоўваць у навучанні мове як замежнай. На пачатку вывучэння яшчэ можна пасля праслухоўвання апавяданняў



Хто?	Кацярына	Алесь	Надзея	Я
Кім марылі стаць у дзяцінстве?				
Якія маюць хобі і захапленні?				
Якую адукацыю атрымалі?				
Кім працуюць цяпер?				

Ілюстрацыя 1. Аўдыяванне і запаўненне табліцы паводле пачутага палілогу

ці дыялогаў выкарыстоўваць заданні кшталту *Праўда ці хлусня?* з перафразаваннем варыянтаў адказу сінанімічнымі канструкцыямі, але на пазнейшых этапах лепей заданні ўскладняць. Напрыклад, на занятках пра прафесіі гучыць гутарка сяброў на сустрэчы выпускнікоў, і яны размаўляюць пра тое, дзе вучыліся, кім сталі, якія маюць хобі і кім марылі стаць у дзяцінстве. Тут задача студэнтаў не столькі зразумець сэнс сказанага, колькі правільна запоўніць табліцу, не пераблытаць, дзе чые мары і хобі (добра дадаць яшчэ пры запісе гутаркі музыку на фон, каб ускладніць успрыняцце).

Заданні на слуханне могуць з'яўляцца штуршком, тэматычным імпульсам для маўленчай практыкі. Напрыклад, пасля запаўнення табліцы пра Кацярыну, Надзею і Алеся можна падзяліць групу на пары ці тройкі і папрасіць вусна запоўніць гэтую табліцу пра сябе, абмеркаваць у групе, кім удзельнікі марылі стаць у маленстве, дзе вучыліся, кім працуюць і чым захапляюцца цяпер. У гэты час настаўнік слухае і занатоўвае памылкі ў гаварэнні, каб да іх вярнуцца напрыканцы заняткаў.

Для падрыхтоўкі аўдыязаданняў настаўніку беларускай мовы неабходна быць сцэнарыстам і рэжысёрам дыялогаў ці аўдыягісторый або падбіраць замежны кантэнт і адаптоўваць яго па-беларуску, а яшчэ выкарыстоўваць сваіх знаёмых як актораў для гуказапісу. Напрыклад, для заняткаў пра будучыню быў перакладзены на беларускую мову англамоўны ролік пра тэставыя палёты крылатага аўтамабіля, агучаны на два галасы парай сяброў і змантаваны студыяй агучкі фільмаў.

Гэты ролік быў навіной з мноствам тэхнічных дэталяў пра аб'ём рухавіка і конскія сілы, таму па праслухоўванні студэнтам прапаноўвалася заданне *Праўда ці хлусня?*. Напрыклад, у арыгінале сертыфікат на палёты быў выдадзены Камітэтам дзяржаўнай бяспекі, а ў практыкаванні – Камітэтам дзяржаўнай небяспекі (хлусня). Або ў рэпартажы вялося пра бензінавы рухавік і 500 літраў паліва, а ў адказах узнік крылаты электрамабіль



Ілюстрацыя 2. Аўдыяванне і заданне на "Праўда ці хлусня?"


(хлусня). Такім чынам, гэтае заданне паспрыяла праверцы разумення тэхнічных дэталяў пачутага тэксту і сталася нагодай для абмеркавання, ці хацелі б навучэнцы мець уласны крылаты аўтамабіль, ці вераць яны, што хутка мы ўсе будзем лётаць у адпачынак на Марс, і якія яшчэ вынаходніцтвы ў будучыні могуць спрасціць або ўскладніць нам жыццё.

Крыніцай для аўдыявання могуць быць аўдыякнігі, радыёпраграмы ці падкасты. Песні рэпераў або інтэрв'ю могуць быць добрай асновай для практыкавання ў запаўненні прагалаў у тэксце пачутымі словамі ці фразамі. Напрыклад, у межах заняткаў пра каханне і сэкс мы слухалі эсэ Рыгора Барадуліна *Як беларусы сэксам займаюцца* [Барадулін 2014] і выпісвалі ўстойлівыя выразы з яго.


Але асноўная складанасць – гэта пошук па аўдыятэкстах: немагчыма адшукаць патрэбныя 2–3 хвіліны аўдыя пад тэматычны ці граматычны запыт. Застаецца або спажываць шмат беларускамоўнага кантэнту і запамінаць цікавыя ўрыўкі або ствараць аўдыягісторыі ўласнаруч.

Асабліва істотнае значэнне такія заданні набываюць для беларусаў у кантэксце ўспрымання і засваення вымаўленчых асаблівасцяў беларускай мовы, найперш асіміляцыйнай мяккасці зычных, акання, гэкання, спецыфікі гучання падоўжаных і зацвярдзелых гукаў ды іншых характэрных фанетычных з'яваў. Таму варта ўважліва ставіцца да адбору аўдыявізуальнага матэрыялу, каб выпадкова не даць прыклад памылковага вымаўлення.

Чытанне і разуменне пісьмовых тэкстаў. Практыкаванні, арыентаваныя на чытанне і разуменне тэкстаў, якія часта ўжываюцца ў выкладанні мовы як замежнай, тут часцей выкарыстоўваюцца для іншых мэтаў. Напрыклад, тэкст блогеркі пра любоў да сябе быў выкарыстаны на занятках пра цела чалавека для засваення граматычнага правіла пра скланенне займенніка *сябе*. Варта адзначыць, што для чытання на занятках часцей абіраюцца тэксты не з мастацкай літаратуры, бо найперш важна паказаць вучням не ўзорныя прыклады валодання словам, а побытавыя



Ілюстрацыя 3. Аўдыяванне і занатаванне прыказак, прымавак і фраземаў



Ілюстрацыя 4. Чытанне і граматычнае заданне на выбар слушнай формы

сітуацыі, у якіх ім самім даводзіцца карыстацца беларускай мовай.


Для заняткаў пра музыку быў перакладзены допіс з Reddit Осціна Чэпмана, які ў 23 гады ўпершыню пачуў музыку (дагэтуль ён быў глухі, але цяпер вынайшлі новыя слыхавыя апараты, якія дазволілі яму пачуць гукі гэтага свету). Осцін прасіў аўдыторыю параіць, з чаго пачаць слухаць музыку. На занятках ангельскай прапаноўваецца выканаць заданні паводле тэксту, але на занятках беларускай вучні разважалі ў групах над пытаннямі на развіццё маўлення:

1. Калі б вы былі на месцы Осціна, якім чынам вы б пачалі спазнаваць дзівосны свет музыкі?
2. Якую музыку вы далі б паслухаць іншапланетнікам?
3. Якое месца музыка займае ў вашым жыцці?


Пісанне. Практыкаванні на пісанне звычайна задаюцца ў якасці дамашніх заданняў, каб у навучэнцаў была магчымасць падумаць над тэкстам, пагартаць слоўнікі, перагледзець канспект папярэдняй тэмы і засвоіць пройдзеную лексіку. Пасля тэмы *Дом і мэбля* ў хатнім заданні трэба апісаць свой дом мары. Пасля тэмы *Колькі трэба грошай для шчасця?* навучэнцы пішуць эсэ *Чаго мне бракуе для шчасця?*.

Таксама ў межах двухмесячнага курса задаюцца не толькі штотыднёвыя дамашнія заданні, але і маленькія заданні дня, якія часцей за ўсё трэба менавіта напісаць у чат групы – гэта дапамагае “захоўваць неабходны ўзровень беларускай мовы ў крыві” на працягу ўсяго курса. Гэта могуць быць 30 спосабаў аднаўлення ўласнага рэсурсу, 5 фразеалагізмаў з этымалогіяй або 3 моцныя бакі твайго характару – важна, каб заданне было цікавым і нагадвала ідэю для допісу ў блог або для размовы з сяброўкай, то бок было актуальным і карысным, узбагачала лексічны запас або веды граматычных нюансаў, будзіла нейкія асацыяцыі, успаміны ці мары.

Таксама на занятках можна выкарыстоўваць розныя дошкі (напрыклад, Canva, Miro ці Padlet) або воблака словаў (напрыклад, Answergarden) для мазгавога штурму, калі ўсёй групе прапаноў-



Ілюстрацыя 5. Заданне на стварэнне вясельнага зычэння




Ілюстрацыя 6. Тэставыя заданні на пошук адпаведнай формы

ваецца напісаць свае асацыяцыі на тэму (сям'я, дом, пачуцці да сябе), прыдумаць уласныя зычэнні на вяселле або стварыць беларускія кляцьбоны (каб цябе пярун ляснуў і г. д.).

Граматыка. Практыкаванні на замацаванне граматыкі ў выкладанні мовы як замежнай і як роднай у плане методыкі перагукаюцца: часта ўжываюцца прыктыкаванні на пошук памылак у сказах (хаця ў лінгвадыдактыцы неадназначнае стаўленне да гэтага тыпу заданняў), на раскрыццё дужак і пастаноўку слова ў слушную форму.

Таксама добра ўжываць інтэрактыўныя тэсты ці гульні для засваення граматыкі – у гэтым дапамагаюць платформы Wordwall і Quizlet. Заданні на граматыку даволі добра пададзеныя і ў школьных падручніках беларускай мовы, тут беларускія настаўнікі маюць на што абаперціся. Аднак варта сачыць, каб сам змест ска́заў быў не надта архаічны: не толькі пра жытняе поле, трактар і рачулку на ўзлеску, а больш пра відэагульні і штучны інтэлект.

Лексіка. Практыкаванні на замацаванне лексікі прапануюцца ў фармаце інтэрактыўных тэстаў, прычым тэст часта даецца яшчэ да знаёмства групы з асноўным лексічным мінімумам па тэме, каб праверыць, што аўдыторыя ўжо ведае з гэтай тэмы. Тут заданні могуць быць на размежаванне словаў на дзве групы, чацвёртае лішняе, злучэнне словаў і іх значэнняў або словаў і іх выяваў.




Ілюстрацыя 7. Заданне на спалучэнне найменняў ягад з іх выявамі

Устаўленне новых словаў у кантэкст эфектыўна дазваляе засвоіць спалучальнасць словаў, іх скланенне ці спражэнне. Акцэнт у дадзеным выпадку робіцца на камунікатыўным падыходзе, каб студэнты ўмелі ўжыць вывучаныя словы ў сваім маўленні. Таму пасля вывучэння тэматычнага слоўніка рэкамендуецца адразу правесці бліц-апытанне: задаць кожнаму ўдзельніку ці ўдзельніцы пытанне, якое вымагае адказу з ужываннем новых словаў. Напрыклад, калі тэма *Ежа*, то пасля можна спытаць:

1. З чаго складаецца найсмачнейшая на твой густ салата?
2. Якую піцу ты заказваеш найчасцей?
3. Якую страву ты ненавідзіш з дзяцінства?

Адзінае, чаму ніколі і нідзе не вучаць, – гэта знаходзіць памылкі ў машынных перакладах. Найчасцей яны ўзнікаюць падчас перакладу шматзначных словаў, і навучыцца бачыць памылку не так проста. Таму на занятках можна гуляць у рэдактараў-дэтэктываў, якія спрабуюць высветліць, чаму ў тэксце паўстала *засмучэнне страўніка* і што там было ў арыгінале (*расстройство желудка*).

У задачы настаўніка таксама ўваходзіць навучанне студэнтаў не перакладаць фразы паслоўна



Ілюстрацыя 8. Пераклад сказа пры дапамозе Google Translate



Ілюстрацыя 9. Заданне на развіццё маўлення

з мовы-арыгіналу, а знаходзіць ім свае фразеалагічныя адпаведнікі ці больш уласцівыя сінтаксічныя канструкцыі ў беларускай мове. Напрыклад, вось як Google Translate перакладае фразу *а ты сидишь тут как ни в чем не бывало и даже свечи не зажгла*:

А больш натуральна па-беларуску гучала б неяк так: *А ты сядзіш тут як нічога ніякага і нават свечак не запаліла*. Пры адмоўі ў беларускай мове часцей ужываецца родны склон, а паслоўны пераклад устойлівых выразаў – гэта сур'ёзная маўленчая памылка, мусім знайсці беларускі адпаведнік ідыёме: *як нічога ніякага* або *анігадкі*.

Інтэрактыў і гейміфікацыя. На занятках з дарослымі таксама варта ўжываць розныя гульні і прыёмы гейміфікацыі – яны любяць гэта яшчэ болей, чым дзеці. На занятках пра музыку дарэчы гульня ў *Адгадай мелодыю*, на занятках пра адпачынак можна правесці двубой паміж камандамі прыхільнікаў падарожжаў на самоце і ў кампаніі, а на занятках пра канфлікты – ставіць сцэнкі і потым "уручаць Оскара" за найлепшую галоўную ролю.

Падчас адбору матэрыялу для заняткаў аўтарка выпрацавала для сябе крытэр: ці захочуць вучні абмеркаваць гэтую тэму потым з сваімі калегамі ці сямейнікамі? Ці настолькі гэта цікава, каб працягваць пра гэта думаць, калі заняткі ўжо скончацца? Гэта дапамагае адшукаць сапраўды цікавыя тэксты і аўдыявізуальныя матэрыялы для заняткаў.

Высновы. Такім чынам, падсумоўваючы, трэба адзначыць, што інтэграцыя метадаў выкладання мовы як замежнай у вывучэнне беларускай мовы беларусамі магчымая і можа быць паспяховай, аднак вымагае шмат высілкаў ад настаўніка пры падрыхтоўцы да заняткаў. Абмежаванне на выкарыстанне аўдыявізуальных матэрыялаў па-беларуску накладае таксама сітуацыя ў Беларусі, калі любы тэкст ці аўдыявізуальныя матэрыялы могуць быць прызнаныя экстрэмісцкімі, а гэта ставіць пад пагрозу і адукацыйныя праекты, і іх навучэнцаў.

З аналізу існых метадычных напрацовак відавочна, што неабходна ствараць сучасныя інтэрактыўныя адукацыйныя прадукты ў галіне вывучэння беларускай мовы з ужываннем метадаў і практыкаванняў, якія добра зарэкамендавалі сябе ў методыцы выкладання мовы як замежнай, з пэўнай іх адаптацыяй пад патрэбы беларусаў, якія хочуць пачаць размаўляць па-беларуску або палепшыць свае навыкі маўлення. Гэтую ж канцэпцыю паяднання метадаў выкладання беларускай мовы як роднай і як замежнай варта ўводзіць і ў беларускіх школах, што дазволіць вучням прасцей асвоіць беларускую мову ва ўмовах адсутнасці беларускага атачэння.

Аднак заўважана, што словазлучэнне *беларуская мова як замежная* многімі ўспрымаецца не як педагагічны тэрмін, які апісвае комплекс метадычных прыёмаў, а як чырвоны сцяг, як балючы трыгер. Пачуўшы яго, ніхто ўжо не хоча разбірацца ў сутнасці. Мяркуецца, што калі пачаць беларусаў вучыць пры дапамозе метадаў выкладання беларускай мовы як замежнай, то яна сапраўды стане беларусам замежнай. Таму ў расоўванні ідэі спалучэння метадаў выкладання мовы як роднай і замежнай варта пільна абіраць тэрміны. Гэта можа быць глотадыдактычны падыход, маўленча-арыентаваны прынцып, камунікатыўна-маўленчы падыход, развіццё маўленчых кампетэнцый, акцэнт на лексіцы і граматыцы ў процівагу правапісу і пунктуацыі… Важна не заблукаць у тэрміналагічных пошуках, перастаць ігнараваць праблему і распрацаваць інструменты для яе эфектыўнага пераадолення.

References

Бандаровіч Вераніка. 2024. *Самаідэнтыфікацыя і моўныя прыярытэты беларускай моладзі 20-х гг. XXI ст.* „Acta Albaruthenica" 24: 29–39 [Bandarovič Veranika. 2024. *Samaidèntyfikacyja i moŭnyja pryjarytèty belaruskaj moladzi 20-x hh. XXI st.* „Acta Albaruthenica" 24: 29–39].

Барадулін Рыгор. 2014. *Як беларусы сэксам займаюцца* [Baradulin Ryhor. 2014. *Jak belarusy sèksam zajmajucca*] [online] https://soundcloud.com/svaboda/znyzdwf2xmxi?in=keil-dorohm/sets/asasasa [30.09.2025].

Баршчэўскі Лявон. 2020. *Круглы стол "Дасьледаваньне PISA-2018. Высновы і інтэрпрэтацыі"* [Barščeŭski Liavon. 2020. *Kruhly stol "Daśledavańne PISA-2018. Vysnovy i interpretacyi"*] [online] https://www.svaboda.org/a/30379607.html [30.09.2025].

Валочка Ганна. 2020. *Кампаненты сістэмы навучання беларускай мове як замежнай*. "Belaruskaja Mova jak Zameznaja" 4: 5–12. [Valočka Hanna. 2020. *Kampanenty sistèmy navučannja belaruskaj move jak zamežnaj*. "Belaruskaja Mova jak Zameznaja" 4: 5–12] [online] https://bmz.kb.uw.edu.pl/wp-content/uploads/sites/208/2024/01/Valochka-5-12.pdf [30.09.2025].

Гіліца Марыя. 2024. *Беларуская мова і ідэнтычнасць: сувязь і значэнне для беларусаў "хваляў беларускамоўнасці" 2020 і 2022 гадоў* [Hilica Maryja. 2024. *Bielaruskaja mova i identyčnaść: suviaź i značeńnie dla biełarusaŭ "chvalaŭ biełaruskamoŭnaści" 2020 i 2022 hadoŭ*][online]
https://kamunikat.org/shto-dlya-belarusaw-belaruskaya-mova-dasledavanne-pra-khvali-belaruskamownastsi-2020-i-2022-gadow [30.09.2025].

Кайданава Вольга. 2024. *Выкарыстанне метадаў і прыёмаў развіцця крытычнага мыслення на ўроках беларускай мовы з мэтай фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў*. У: *Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце : матэрыялы IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі*. Віцебск. 124–128 [Kajdanava Voĺha. 2024. *Vykarystanne metadaŭ i pryëmaŭ razviccja krytyčnaha myslennja na ŭrokax belaruskaj movy z mètaj farmiravannja maŭlenča-kamunikatyŭnaj kampetèncyi vučnjaŭ*. U: *Belaruskaja mova i litaratura ŭ slavjanskim ètnakuĺturnym kantèksce: matèryjaly IV Mižnarodnaj navukova-praktyčnaj kanferèncyi*. Vicebsk. 124–128] [online] https://rep.vsu.by/handle/123456789/44489 [30.09.2025].

Калета Радослав. 2015. *Белорусский язык как (ино) странный, чужой и родной в начале XXI века*. У: Л. А. Ліхадзіеўская, В. А. Мандзік, В. Л. Татур,

Н. А. Чабатар, К. Д. Шчасная (рэд.). *Беларуская мова ў XXI стагоддзі: асноўныя тэндэнцыі развіцця (да 80-годдзя акадэміка А. І. Падлужнага). Зборнік матэрыялаў Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск, 28–29 кастрычніка 2015 года.* Мінск. 142–149 [Kaleta Radaslaŭ. 2015. *Belorusskij jazyk kak (ino)strannyj, čužoj i rodnoj v načale XXI veka*. U: L. A. Lixadzieŭskaja, V. A. Mandzik, V. L. Tatur, N. A. Čabatar, K. D. Ščasnaja (rèd.). *Belaruskaja mova ŭ XXI stahoddzi: asnoŭnyja tèndèncyi razviccja (da 80-hoddzja akadèmika A. I. Padlužnaha). Zbornik matèryjalaŭ Mižnarodnaj navukovaj kanferèncyi, Minsk, 28–29 kastryčnika 2015 hoda.* Minsk. 142–149].

Літвіноўская Алена, Лабадзенка Глеб. 2016. *Мова Нанова: 20 крокаў да беларускай мовы*. Мінск [Litvinoŭskaja Aliena, Labadzienka Hlieb. 2016. *Mova Nanova: 20 krokaŭ da bielaruskaj movy*. Minsk].

Літвіноўская Алена, Лабадзенка Глеб. 2017. *Мова Нанова: 20 крокаў да беларускай мовы*. Ч. 2. Мінск [Litvinoŭskaja Aliena, Labadzienka Hlieb. 2017. *Mova Nanova: 20 krokaŭ da bielaruskaj movy*. Č. 2. Minsk].

Ляўковіч Алена. 2025. *Як захаваць адзін з самых важных складнікаў культурнага кода нацыі?* [Liaŭkovič Aliena. 2025. *Jak zachavać adzin z samych važnych skladnikaŭ kuĺturnaha koda nacyi?*] [online] https://zviazda.by/news/yak-zakhavats-adzin-z-samykh-vazhnykh-skladnika-kulturnaga-koda-natsyi/ [30.09.2025].

Маслянкова Паліна. 2025. *Мова і тоеснасць: карані матывацыі вывучэння беларускай мовы сярод дарослых беларусаў*. „Acta Albaruthenica" 25: 153–164 [Masliankova Palina. 2025. *Mova i tojesnasć: karani matyvacyi vyvučennia bielaruskaj movy siarod daroslych bielarusaŭ*. „Acta Albaruthenica" 25: 153–164].

Рамза Таццяна. 2010. *Беларуская мова? З задавальненнем!* Для замежных навучэнцаў. Мінск [Ramza Tacciana. 2010. *Bielaruskaja mova? Z zadavaĺnienniem!* Dlia zamiežnych navučencaŭ. Minsk].

Рамза Таццяна. 2017. *"Кампрамісныя" дапаможнікі для самастойнага вывучэння беларускай мовы, іх плюсы і мінусы*. У: А. М. Ермакова (рэд.). *Спадчына Скарыны: да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Зборнік навуковых артыкулаў: у 2 ч.* Ч. 2. Гомель. 149–155 [Ramza Tacciana. 2017. *"Kampramisnyja" dapamožniki dlia samastojnaha vyvučennia bielaruskaj movy, ich pliusy i minusy*. U: A. M. Ermakova (rèd.). *Spadčyna Skaryny: da 500-hoddzia bielaruskaha knihadrukavannia*. Zbornik navukovych artykulaŭ: u 2 č. Č. 2. Homieĺ. 149–155].

Сомин Антон. 2017. *Белорусский язык. Самоучитель*. Москва [Somin Anton. 2017. *Belorusskij jazyk. Samoučitel'*. Moskva].

Шандроха Нона. 2010. *Камунікатыўна-маўленчы аспект выкладання беларускай мовы і сучасная школьная практыка*. У: Т. Я. Янчук (рэд.). *Мова – Літаратура – Культура*: матэрыялы VI Міжнароднай навуковай канферэнцыі. Мінск. 107–111 [Šandrocha Nona. 2010. *Kamunikatyŭna-maŭlienčy aspiekt vykladannia bielaruskaj movy i sučasnaja škoĺnaja praktyka*. U: T. Ja. Jančuk (rèd.). *Mova – Litaratura – Kuĺtura*: materyjaly VI Mižnarodnaj navukovaj kanfierencyi. Minsk. 107–111] [online] https://elib.bsu.by/handle/123456789/23904 [30.09.2025].